# 25 красавіка 2025 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовы блок «Сумесны выпуск Беларусі і Расіі. 80-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне»

25 красавіка 2025 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовы блок «Сумесны выпуск Беларусі і Расіі. 80-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне».

Дызайн А. Мядзведзь.

Блок друкаваўся ў РУП «Бабруйская ўзбуйненая друкарня імя А.Ц. Непагодзіна».

Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне – адна з самых значных старонак нашай гісторыі. Абараняючы сваю Радзіму, савецкі народ праявіў неверагодную згуртаванасць, стойкасць і храбрасць. Гэты подзвіг назаўжды застанецца ў памяці нашчадкаў як прыклад найвялікшага патрыятызму і любві да Айчыны.

Праект падрыхтаваны па матэрыялах з фондаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і прыватнай калекцыі С.У. Піліповіча.

У дзень выпуску паштовага блока ў абарачэнне на паштамце Мінска і ў аддзяленні паштовай сувязі № 25 Гродна будуць праводзіцца спецыяльныя гашэнні на канверце «Першы дзень».

**Source URL:** *https://www.mpt.gov.by/node/10410*